нізаваных разуменнем музыканта ў паняцці і размеркваных у сістэме мадэлі мовы.

Валасюк Л.К.,
дацэнт

## УДАСКАНАЛЕННЕ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ КІРАЎНІКА АНСАМБЛЯ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

Работа кафедры народна-інструментальнай творчасці па ўдасканаленні вучэбнага працэсу знайшла адлюстраванне ў падрыхтоўцы спецыялістаў розных напрамкаў: дырыжор аркестра, кіраўнік ансамбля, канцэртмайстр, выкладчык спецінструмента і дысцыплін дырыжорскага цыкла. Пры адборы студэнтаў на пэўную спецыяльнасць улічваюцца іх музычныя здольнасці, узровень базавай падрыхтоўкі, неабходныя прафесійныя навыкі, а таксама і жаданне. Работа кафедры ў такім напрамку патрабуе ад выкладчыкаў пастаянна ўдасканальваць сваё прафесійнае майстэрства і больш скрупулёзна рыхтаваць студэнтаў па абранай спецыяльнасці. Ансамблевае выканальніцтва на народных інструментах вельмі распаўсюджана як у навучальных установах, так і ў самадзейнасці. Саставы інструментальных ансамбляў вельмі розныя. Яны складаюцца як з аднародных інструментаў, так і змешаных, розняцца і ў колькасных адносінах. Пры кафедры ў цяперашні час створаны разнастайныя вучэбныя ансамблі. Работа змешаных саставаў у гэтым накірунку павінна і далей удасканальвацца, але для больш практычнай падрыхтоўкі кіраўніка ансамбля лічым неабходным вучыць студэнтаў і ў малых формах ансамбляў (дуэтах, трыо). Безумоўна, кіраўнік ансамбля павінен практычна засвоіць усе формы ансамбляў.

Ансамбль - гэта адна з найважнейшых форм калектыўнага выканання, якая спрыяе фармаванню прафесійных якасцей, пашырае музычныя веды студэнта, удасканальвае навыкі ансамблевага выканальніцтва, пашырае рэпертуарны багаж будучага кіраўніка калектыву. Адна з асноўных асаблівасцей ансамблевай ігры -- гэта адзінае разуменне выканаўцамі зместу твора, адзіная трактоўка яго ўсімі ўдзельнікамі ансамбля. Гэта калектыўная творчасць, дзе кожная партыя мае свае задачы, свае функцыі, і, толькі спалучыўшы іх разам, мы пачуем поўнае гучанне партытуры.

У працэсе работы ў класе ансамбля неабходна вырашаць наступныя задачы:

1. Удасканаленне студэнтамі выканальніцкіх навыкаў на інструментах.
2. Засваенне навыкаў ансамблевага выканальніцтва.
3. Развіццё навыкаў чытання нот з ліста ва ўмовах ансамблевай ігры.
4. Фармаванне рытмічнай узгодненасці ў працэсе выканання.
5. Вызначэнне неабходных дынамічных суадносін галасоў, авалоданне ўсімі спецыфічнымі асаблівасцямі дынамікі.
6. Засваенне ансамблевага рэпертуару.
7. Вывучэнне методыкі работы з ансамблем.
8. Засваенне навыкаў выкарыстання розных сродкаў выканання.

Практычнае засваенне тэхнічных магчымасцей інструментаў, іх аплікатурных асаблівасцей, тэмбравага гучання аказвае вялікую дапамогу студэнтам пры выкананні інструментовак як для разнастайных ансамбляў, так і для аркестраў. Студэнты іграюць у ансамблі творы, інструментаваныя пад кіраўніцтвам выкладчыка па інструментоўцы. Вучэбны ансамбль - гэта творчая лабараторыя, дзе ён вучыцца практычным навыкам інструментоўкі. Павінна быць вельмі цесная сувязь выкладчыкаў па інструментоўцы з вучэбным ансамблем. Другі шлях дзеля дасягнення большай эфектыўнасці і выніковасці вучэбнага працэсу можа быць наступны: выкладчык-кіраўнік ансамбля выкладае інструментоўку ў студэнтаў-удзельнікаў ансамбляў. Гэта дае магчымасць больш якасна працаваць з імі.

Вялікая роля выкладчыка і кіраўніка ансамбля ў падборы рэпертуару, вызначэнні складу ансамбля для выканання кожнага канкрэтнага твора. Для вырашэння гэтай задачы неабходна, каб студэнт меў практычныя навыкі ігры на розных народных інструментах і мог пры неабходнасці іграць на некалькіх. На вялікі жаль, такая патрэбная практычная дысцыпліна, як вывучэнне аркестравых інструментаў, знікла з вучэбнага плана.

Калі студэнт будзе мець такую практычную падрыхтоўку (валодаць 3--4 інструментамі), то гэта дазволіць рабіць разнастайным склад ансамбля, больш якасна, прафесійна рыхтаваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

будучых кіраўнікоў ансамбляў. Ім, а таксама і дырыжорам аркестра трэба набыць больш практычных ведаў і навыкаў, неабходных у іх прафесійнай падрыхтоўцы. У нас, на жаль, зараз назіраецца тэндэнцыя да павелічэння лекцыйных тэарэтычных курсаў. Студэнта сёння неабходна забяспечыць не толькі моцнай тэарэтычнай падрыхтоўкай, але і практычным засваеннем сваей спецыяльнасці. Неабходны комплексны падыход да ўдасканалення вучэбнага працэсу, удасканалення прафесійнай падрыхтоўкі кіраўніка ансамбля народных інструментаў.

Акуліч У.А.,
канд.гіст.навук,
дацэнт

## СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ "МЭНЕДЖЭР ІНФАРМАЦЫІ БІЗНЕСУ І БІБЛІТЭЧНАЙ СПРАВЫ"

1. Па меркаванню многіх прадстаўнікоў бібліятэчнай прафесіі, бібліятэчная справа знаходзіцца ў крызісным стане. Рэзка скарачаецца сетка бібліятэк, а з ёю і рабочыя месцы. У выпускнікоў нашага факультэта з'явіліся праблемы з размеркаваннем. Мы, выкладчыкі факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, павінны забяспечыць іх будучыню. На наш погляд, адзін са шляхоў вырашэння гэтай прабле-мы — набыццё дадатковай прафесіі.

2. Рэспубліка Беларусь спрабуе перайсці да рынку. Бібліятэчная прафесія, дзякуючы сваёй разнастайнасці, добра прыстасавана да яго. Адным з напрамкаў сумяшчэння бібліятэчнай прафесіі з умовамі рынку, на наш погляд, з'яўляецца прафесія "мэнеджэр інфармацыі бізнесу і бібліятэчнай справы". Гэта арганізатар інфармацыйных працэсаў для разнастайных відаў дзейнасці, уцягнутых у вытворчасць тавараў і паслуг. Яе асновай з найбольш поўнай базай дадзеных з'яўляецца бібліятэка. Мы лічым магчымым аб'яднаць гэтыя паняцці ў працэсе набыцця прафесіі.

3. Мяркуем, што падрыхтоўка мэнеджэра інфармацыі бізнесу і бібліятэчнай справы павінна насіць двухступеньчаты характар. Першая ступень падрыхтоўкі - бібліятэчна-інфармацыйны каледж, дзе выпускнік атрымлівае разам з сярэдняй адукацыяй і спецыяльную. Другая ступень пачынаецца з III курса універсітэта. Тут студэнт атрымоўвае вышэйшую адукацыю з прысваеннем яму звання бакалаўра ці магістра.

4. Спецыяліст рыхтуецца для практычнай, бібліятэчна-інфармацыйнай і камерцыйнай, арганізацыйна-кіраўніцкай дзейнасці ў розных галінах народнай гаспадаркі, на ўнутраным і знешнім рынку Рэспублікі Беларусь.

Спецыяліст прызначаны для працы ў бібліятэках усіх тыпаў, бібліятэчна-інфармацыйных службах і рэкламных офісах, аддзелах маркетынгу, навукова-тэхнічнай і камерцыйнай інфармацыі, у сумесных малых прадпрыемствах, асацыяцыях, канцэрнах, холдынгах, акцыянерных аб'яднаннях, дамах продажу, біржах, дызайнавых кампаніях, вытворчых кааператывах, а таксама ў агенцтвах па збіранню дзелавой інфармацыі.

5. Спецыяліст можа працаваць у якасці: бібліёграфа, спецыяліста па абслугоўванню карыстальнікаў, сакратара-рэферэнта, перакладчыка інфармацыі, маркетолага, аператара ЭВМ, спецыяліста па праблемах запытаў, спецыяліста служб і арганізацыі грамадскай думкі, спецыяліста ў сферы арганізацыі камерцыйнай і дзелавой інфармацыі, а таксама на ін-шых пасадах, якія маюць адносіны да біб-ліятэчнай, інфармацыйнай і камерцыйнай дзейнасці, да мэнеджмэнту, маркетынгавых даследаванняў і інфармацыі бізнесу.

Спецыяліст павінен ведаць:

агульнаадукацыйныя дысцыпліны ў аб'ёме сярэдняй школы; замежныя мовы, літаратуру краін вывучаемых моў, краіназнаўства; эканамічныя дысцыпліны, якія ўключаюць эканоміку рыначных адносін, маркетынг, мэнеджмэнт, арганізацыю малога бізнесу, асновы фінансавання, крэдытавання і бухгалтарскага ўліку, прававое афармленне камерцыйнай дзейнасці; асновы дысцыплін бібліятэчна-інфармацыйнага цыкла, якія ўключаюць дакументы як крыніцы інфармацыі; тэхналогію фармавання інфармацыйных фондаў, аналітыка-сінтэтычную апрацоўку інфармацыі, бібліятэчныя сістэмы: універсальную інфармацыю аб дакументах, інфармацыю ў галіне эканомікі, тэхнікі, сельскай гаспадаркі і вытворчасці, інфармацыйны пошук; практычнае выкарыстанне вылічальнай тэхнікі, аргтэхніку ў працы мэнеджэра, абслугоўванне карыстальнікаў інфармацыі; бібліятэчна-інфармацыйны мэнеджмэнт і марке-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ